# ШЛЯХТА БЕЛАРУСІ

**Напярэдадні Люблінскай уніі 1569 г., да утварэння федэрацыі ВКЛ і Польшчы, у Беларусі пражывала 1,8 мільёна жахароў, якія па свайму сацыяльна-эканамічнаму становішчу адносіліся да чатырох саслоўяў: шляхты, сялян, мяшчан, духавенства.**

**Шляхта — прывілеяванае саслоўе на тэрыторыі сучасных Беларусі, Польшчы, Украіны, Літвы, Чэхіі ў 13 — 20 стагоддзі. Ёсьць два вызначэнні слова шляхта: людзі бою, ваякі, ваяры або «род, паходжаньне, парода». Слова «шляхта» паходзіць ад нямецкага schlagen — біць, а нямецкае слова Schlacht азначае «бітва».**

**Ад Люблінскай уніі 1569 г. шляхецтва надаваў Сойм Рэчы Паспалітай (набілітацыя). Шляхецкія саслоўныя правы роду пераходзілі нашчадкам-мужчынам ды іхным нашчадкам у мужчынскім родзе, а таксама дочкам (але ня іхным дзецям, бо гэта быў ужо іншы род). Вядомыя князі, ваяводы, кашталяны, гетманы, канцлеры — Радзівілы, Сапегі, Глябовічы, Хадкевічы, Пацы, Вішнявецкія, Агінскія, Астрожскія, Кішкі, Завішы, Тышкевічы, Валовічы, Гальшанскія.**

**У 16 ст. 80 працэнтаў фэадалаў на Беларусі былі беларускага этнічнага паходжаньня, 19 працэнтаў — літоўскага, 1 працэнт — іншага. Усяго налічваецца каля 5 тысячаў гербаў польскай, беларускай, літоўскай і ўкраінскай шляхты ў Рэчы Паспалітай.**


*Герб Гальшанаў*


*Герб «Калюмны»*


*Герб “Пагоня”*


*Герб Сыракомля*


*Герб Прыяцель*

**У Беларусі ў канцы 19 ст. шляхты было 10-12%, тады як удзельная вага дваранства Расіі, Прусіі, Аўстрыі ў 18-19 ст.ст. складала каля 1 % насельніцтва. Пасля паўстання 1831 г. ад усіх дваранаў-шляхты патрабавалі ў якасці доказаў шляхецтва толькі арыгінальныя дакуманты. У 1857 г. шляхцічамі былі 6% насельніцтва Віленскай губерні, 4.7% - Гродненскай, 3.8% - Віцебскай, 4.2% - Магілёўскай, 6% - Мінскай; ва ўсіх 5 губернях налічвалася каля 220.000 шляхты. Лічыцца, што ў Беларусі сёння больш за 1 мільён чалавек маюць шляхецкія і дваранскія карані.**